УДК 2

# РОЛЯ ЗАМОЙСКАГА САБОРУ 1720 г. У РАЗВІЦЦІ ЎНІЯЦКАЙ АДУКАЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**Самусік Андрэй Фёдаравіч,**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле аналізуюцца рашэнні Замойскага сабору 1720 г., якія датычыліся паляпшэння адукацыі белага святарства, манахаў, а таксама свецкіх колаў уніяцкага веравызнання. Паказана стаўленне да іх рэалізацыі асобных айчынных царкоўных іерархаў. Прыводзіцца інфармацыя аб актывізацыі выдавецкай дзейнасці ўніятаў з аналізам асноўных вучэбна-метадычных кніг, выпушчаных адпаведна яго пастановам.*

Уніяцкая царква ў пачатку XVIII ст. істотна актывізавала сваю дзейнасць у Рэчы Паспалітай. Пры падтрымцы ўлад пад яе кантроль пераходзілі ўсё новыя і новыя праваслаўныя прыходы са шматлікімі вернікамі. Разам з тым, гэтая канфесія мала ўвагі ўдзяляла іх належнай адукацыі. Пашыранай практыкай стала вучоба ўніятаў у езуіцкіх калегіўмах, што прывяло да ўзмацнення ў колах уніяцкага насельніцтва лацінскай мовы і пераймання каталіцкіх абрадаў у час



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

богаслужэння. Пры гэтым, агульны ўзровень адукацыі як мірян, так і святароў быў нізкі і часцяком абмяжоўваўся хатнім навучаннем [1, с. 40–42].

З мэтай выпраўлення становішча ды захавання самабытнасці ўніяцкай царквы і быў скліканы па ініцыятыве кіеўскага мітрапаліта Л. Кішкі ў 1720 г. Замойскі сабор. Адукацыйныя пытанні на ім займалі важнае месца. Было вырашана абавязаць кандыдатаў у святары атрымліваць належную адукацыю, а епіскапаў заклікалі адкрываць на падуладных тэрыторыях семінарыі для белага духавенства (альбо адсылаць жадаючых у Львоўскі папскі алюмнат). У сваю чаргу, пры базыльянскіх манастырах з колькасцю манахаў звыш дванаццаці ордэн абязоўваўся засноўваць тэалагічныя студыі ды публічныя вучылішчы з выкладаннем на "простай мове" і запрашэннем свецкіх настаўнікаў. Іншым манастырам дазвалялася мець студыі з выкладаннем маральнай тэалогіі ці дасылаць манахаў на вучобу ў больш заможныя абіцелі. Таксама святарам рэкамендавалася па магчымасці арганізоўваць пры храмах прыходскія школы з вывучэннем Св. Пісання і пачаткаў граматы [2, с. 153–157].

Кіраўніцтва Літоўскай правініцыі базыльян, аднак, праігнаравала рашэнне Замойскага сабору аб навучанні здольных да навук манахаў і святароў у Львоўскім алюмнаце. Яно адмовілася выдзяляць яму адпаведныя стыпендыі, матывіруючы гэта, па-першае, тым, што ў Вільні таксама працавала аналагічная навучальная ўстанова (у 1725 г. у ёй вучылася 6 базыльян і 2 свецкія асобы ўніяцкага веравызнання), а па-другое, прапанавала "адшукаць" грошы, сабраныя калісьці на Мінскую ўніяцкую гімназію (закрыта ў час вайны 1654–1667 гг.) і выкарыстаць іх для пашырэння асветы. Наконт жа адкрыцця семінарый царкоўныя іерархі таксама адказвалі вельмі асцярожна і для пачатку на ўласны кошт паабяцалі выдзяляць сродкі на навучанне асобных прадстаўнікоў белага духавенства. Так, епіскап турава-пінскі Т. Гадэбскі збіраўся вучыць: "двух или одного в каком-нибудь монастыре", а архіепіскап полацкі Ф. Грабніцкі пагадзіўся: "воспитывать на свои средства двух учеников в Жировицком монастыре или в другом удобном месте" [3, с. 325–326, 330]. Пры гэтым, апошні не выключаў магчымасць заснавання ва ўласнай епархіі семінарыі, але пры ўмове фінансавай дапамогі з боку Ватыкана. Разам з тым, Кангрэгацыя прапаганды веры не падтрымала яго хадайніцтва на гэты конт, хаця на баку іерарха выступілі смаленскі біскуп Б. Корвін-Гасеўскі і яго памочнік (суфраган) М. Зенковіч [4, т. 1, с. 354–355].

Важным у вучэбна-метадычным забеспячэнні дзейнасці ўніяцкіх школ сталі рашэнні Замойскага сабору аб актывізацыі выдавецкай дзейнасці. Пераважна, гаворка на ім ішла аб выпраўленні і выпуску богаслужэбных кніг, але была адзначана і адметная роля новай друкарскай прадукцыі вучэбна-маралізатарскага плану. Пры гэтым, Супрасльскі манастыр павінен быў забяспечваць адпаведныя патрэбы ўніятаў у ВКЛ, а Львоўскае брацтва – у Кароне [5, с. 107].

Сярод кніг, выпушчаных у наступныя гады ў Супраслі найперш трэба адзначыць, выдадзенае па ініцыятыве Л. Кішкі ў 1722 г. "Собрание припадков краткое" – з вялікім катэхізісам для святароў і малым катэхізісам для вернікаў на "рускай мове". Напрыканцы тут быў змешчаны раздзел "О науце христианской", дзе адзначалася, што: "Каждый Иерей повинен мовити з Людьми по окончании Службы Божией" наконт абавязкаў добрага хрысціяніна і асноў веравучэння [6, с. 281, 293–312]. Выхад дадзенай кнігі спрыяў вяртанню ва ўжытак уніяцкага святарства



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

беларускай і царкоўнаславянскай моў. Для лепшага ж іх разумення ў тым жа 1722 г. быў перавыдадзены ў скарочаным варыянце “Лексикон сиречь Словесник словенский” П. Бярынды, у прадмове да якога адзначалася прызначэнне гэтага дапаможніка не толькі: “для иерейского сана готовящимся людям, но и самим иереям” [7, с. 1]. У сваю чаргу для патрэб пачатковых школ у 1727 г. выйшаў “Букварь языка словенского” (пазней друкаваўся тут у 1737, 1754 і 1761 гг.), які акрамя алфавітных радоў, складоў ды простых тэкстаў для чытання таксама ўключаў штодзённыя малітвы, дзесяць запаведзяў Божых, пералік дабрачыннасцяў, грахоў, абавязкі дзяцей перад бацькамі і інш. [8, с. 2–13, 42–51, 60–65]. Што ж датычыцца тэмы праведнага вобразу жыцця, то шляхоў яго дасягнення датычылася лацінамоўная праца натарыўса епіскапа ўладзімірска-брэсцкага Я.І. Тэмезвары “Сутнасць раскаяння” (1726) з аналізам разнастайных відаў грахоў і вызначэннем шляхоў ыратавання душы праз споведзі, малітвы, пост і г.д. [9, с. 7–20].

Перадрукоўвалі ў Супраслі і іншыя выданні, здаўна карыстаўшыяся ў Рэчы Паспалітай усеагульным прызнаннем – у 1722 і 1725 гг. тутэйшыя базыльяне выпусцілі ў свет працу І. Флавія “Гісторыя Іўдзейскай вайны”, дапоўненую творам бернардынскага манаха А. Полака “Хараграфія, або Тапаграфія. Гэта значыць непасрэднае і агульнае апісанне зямлі Святой”. Разам з тым, улічваючы тое, што пад такімі тытуламі іх выдавалі ў канцы XVI – пачатку XVII ст. у Кракаве, а таксама пратэстанты ў Вільне ды Любчы, супрасльскія аналагі, гучалі па-іншаму – “Слава старадаўняга Іерусаліма” і “Перэгрынацыя праўдзівага апісання Зямлі святой, Віфлеема і Іерусаліма” адпаведна [10, с. 88]. Да падобнага ж тыпу прадукцыі можна аднесці і гістарычны твор А. Калюдскага “Трон Айчынны” (1727) з апісаннем польскіх манархаў, пачынаючы ад Леха ажно да Яна III Сабескага ўключна [11, с. 24].

Такім чынам, аналізуючы адукацыйныя рашэнні Замойскага сабору 1720 г. можна адзначыць наступнае. Па-першае, сам факт іх наяўнасці сведчыў аб прызнанні кіраўніцтвам уніяцкай царквы факта існавання праблем у школьнай справе. Па-другое, акцэнт тут рабіўся ўсё ж на паляпшэнне стану адукацыі святароў ды манахаў. Па-трэцяе, фактычна ўпершыню за ўсю гісторыю гэтай канфесіі было ўзнята пытанне аб неабходнасці пашырэння асветы ў свецкіх колах уніяцкага насельніцтва. Па-чацвёртае, актывізацыя выдавецкай справы спрыяла не толькі паляпшэнню метадычнага забеспячэння ўніяцкіх школ, але і была важнай умовай для самаадукацыі, як духавенства, так і мірян.

## Літаратура

1 Лісейчыкаў, Д.В. Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720–1839 гг. / Д.В. Лісейчыкаў. – Мінск : Медысонт, 2011. – 198 с.

2 Synod prowincialny ruski w mieście Zamościu roku 1720 odprawiony, a w r. 1724 łacińskim językiem w Rzymie wydany na polski przez J.X. Polikarpa Filipowicza przewiedziony. Pamiętnikiem przedrukowany. – Wilno : Druk. WW. Bazylianów, 1785. – X, 199 s.

3 Ситкевич, А. Униатские кафедральные капитулы в XVIII в. : очерки положения и деятельности белого духовенства в Западно-русской униатской церкви / А. Ситкевич // Христианское чтение. – 1904. – № 9. – С. 320–354.

4 Витебская старина : в 5 т. / сост. А.П. Сапунов. – Витебск : Тип. губернского правления, 1883–1888. – Т. 1. – 1883. – XXII, 668 с.

5 Марозава, С.В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596 – 1839 гады) / С.В. Марозава. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 352 с.

6 Собрание припадков Краткое и Духовным Особом Потребное. – Супрасль : Тип. Монастыря Чину Святаго Василия Великаго, 1722. – 314 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

7 Лексикон сиречь словесник славенский Имеющ в себе, Словеса первее Славенския, Азбучныя, посемже Польския. – Супрасль : Тип. Монастыря Общежителнаго супраслскаго, 1722. – 33 с.
8 Букварь языка славенского Чтения и писания учитися хотящимся в полезное руководжение. – Супрасль : Тип. Монастыря Общежителнаго супраслскаго, 1761. – 65 с.
9 Temesvari, J.I. Anima paenitens ad regulas praeceptorum decalogi, nec non ad fontes capitalium criminum, declinare a malo, et arripere bonum addiscens / J.I. Temesvari. – Supraslii : Typis Ord. S. Basilii Magni, 1726. – XVI, 101 s.
10Pidłypczak-Majerowicz. M. Książka i biblioteka bazyliańska w XVII – XVIII w. oraz wpływ kasat na stan ich zachowania i opracowania / M. Pidłypczak-Majerowicz // Hereditas Monasteriorum. – 2012. – Vol. 1. – S. 85-97.
11Cubrzyńska-Leonarczyk, M. Dziedzictwo Unii Brzeskiej : z dziejów oficyny wydawniczej OO Bazylianów w Supraślu (1695-1803) / M. Cubrzyńska-Leonarczyk. – Białystok ; Warszawa : Wyd-wo "Prymat", 2007. – 82 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова